# Заплаціце жанчыне больш — і атрымаеце багатую краіну

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Жанчына, калі працуе, 90 % свайго прыбытку вяртае ў сям'ю, тым самым ствараючы мультыплікацыйны эфект (мужчына вяртае значна менш). У выніку сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны павышаецца, узровень беднасці ў грамадстве зніжаецца, — тлумачыць **праграмны спецыяліст па гендарных пытаннях Рэгіянальнага офіса ЮНФПА па Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі Нургуль КІНДЭРБАЕВА.** — Жанчыны і дзяўчаты — вельмі добры патэнцыял для эканамічнага росту тэрыторыі, на якой яны пражываюць. І калі мы будзем зніжаць і ліквідаваць гендарны разрыў у сферы чалавечых рэсурсаў, жанчыны прынясуць даход у сярэднім ад 5 да 30 працэнтаў ВУП.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У Беларусі гендарны разрыў у аплаце працы складае 72,7 %. Намінальны налічаны сярэдні заробак у жанчын амаль на 350 рублёў меншы, чым у мужчын.**

Пра тое, чаму не толькі асобна ўзятаму грамадству, але чалавецтву ў цэлым важна ствараць умовы для захавання балансу «сям'я — работа», ішла размова на форуме «Актуальныя кірункі гендарнай палітыкі ў кантэксце Мэт устойлівага развіцця» ў Мінску.

На гэтым форуме, які сабраў беларускіх парламентарыяў, прадстаўнікоў кампаній, міжнародных і грамадскіх арганізацый, замежных і айчынных экспертаў, гаварылі, што гендарная роўнасць выконвае важную ролю ў эканоміцы, у яе пераходзе на «зялёную», гэта значыць, устойлівую з пункту погляду як развіцця, так і захавання экалогіі. Што, калі жанчына прымае кіраўніцкія рашэнні, яна больш звяртае ўвагі на патрэбы ўразлівых катэгорый людзей, сем'яў і на ліквідацыю гендарных стэрэатыпаў.

Іншымі словамі: трохі разгрузіце жанчыну дома, заплаціце ёй больш на рабоце і даверце прыманне рашэнняў — і вы атрымаеце квітнеючую краіну, шчаслівае грамадства і добрую экалогію, а гэта значыць — будучыню.

## НАКІРУЙЦЕ ДЗЯЎЧАТ НА ГРАШОВЫЯ ПРАФЕСІІ

Што нам перашкаджае зрабіць такія справядлівыя і лагічныя крокі? У Беларусі няма няроўнасці сярод хлопчыкаў і дзяўчатак у сферы даступнасці да адукацыі. А значны гендарны разрыў у аплаце працы з'яўляецца з-за таго, што дзяўчынкі часцей выбіраюць спецыяльнасці, якія мала аплачваюцца. Спецыялісты раяць накіроўваць дзяўчат падчас выбару будучай прафесіі. «Трэба іх больш навучаць інфармацыйным тэхналогіям, тэхнічным спецыяльнасцям, інжынерыі, матэматыцы, — лічыць Нургуль Кіндэрбаева. — Мы прыйшлі да таго, што жанчыны працуюць у сацыяльным сектары, а мужчыны — у энергетычным і эканамічным. Гэта называецца галіновая сегрэгацыя».

Спецыялісты даводзяць: парадолець сітуацыю можна з дапамогай STEM-адукацыі. STEM — абрэвіятура навукі (science), тэхналогіі (technology), інжынерыі (engineering) і матэматыкі (mathematics), якія павінны быць інтэграваныя ў адзін навучальны працэс. Уваходжанне вучняў у навуку і тэхналогіі яшчэ ў школьныя гады матывуе на абранне прафесіі, звязанай з імі. Гэта важна для краіны, дзе навукова-тэхнічны патэнцыял прадвызначае эканамічнае развіццё.

Аднак мала дзяўчыне стаць прагамістам альбо інжынерам ці вынаходнікам. Рана ці позна яна паўстане перад выбарам: нараджаць дзіця альбо будаваць кар'еру, займацца навукай. Жанчыне прыходзіцца прынесць свой прафесійны рост у ахвяру мацярынству. Альбо наадварот.

## ДЛЯ БАЛАНСУ ПАТРЭБНЫ ЎМОВЫ

Так атрымліваецца, бо водпуск па доглядзе за дзіцем у нас доўгі — тры гады, за гэты час жанчына цалкам выпадае альбо моцна адстае ад тэмпу развіцця сучасных тэхналогій, галіны, у якой працуе. Аддаць жа дзіця ў садок раней за тры гады праблематычна: малое пачне часта хварэць, бо групы перапоўненыя і выхавацелькам, якія атрымліваюць невялікія заробкі, складана ўдзяліць дастатковую ўвагу кожнаму. А альтэрнатывы дзяржаўным дзіцячым садкам і групам падоўжанага дня ў школе у нас практычна няма.

Прыватныя формы прафесійнага догляду за дзецьмі да трох гадоў не запатрабаваныя з-за высокага кошту паслуг, і, магчыма, іншых, яшчэ пакуль недастаткова вывучаных перашкод (напрыклад, складанасць вядзення такога бізнесу, наяўнасць стэрэатыпаў у грамадстве і іншае).

Доля жанчын, якія маюць дзяцей да трох гадоў і працуюць, у нашай краіне — менш за 10 працэнтаў, у той час як у большасці еўрапейскіх дзяржаў такіх 50 і 70 %. Практычна не выкарыстоўваецца ў нас прапісаны ў заканадаўстве няпоўны працоўны дзень. Толькі 20 працэнтаў дзяцей да трох гадоў наведваюць яслі. Гэта адзін з найбольш нізкіх паказчыкаў на еўрапейскай прасторы. У многіх краінах Паўночнай і Заходняй Еўропы больш за палову дзяцей да трох гадоў ахоплена прафесійнымі паслугамі па доглядзе і дашкольнай адукацыяй.

Такім чынам, дапамагчы жанчыне не страціць свае прафесійныя навыкі, не адстаць ад вытворчага працэсу і не адарвацца ад калектыву магло б развіццё дашкольных устаноў. Нам патрэбны такія, у якія дзіця ідзе без плачу і дзе не падхоплівае інфекцыю ў першы або другі дзень наведвання. Акрамя таго, яны павінны быць даступныя па сродках і па месцы размяшчэння, а таксама зручныя для бацькоў па сваім рэжыме работы. Але і гэтага недастаткова.

**Важна, каб і на рабоце да супрацоўніка, які мае дзіця, ставіліся як да каштоўнасці. Бо, насамрэч, гэта так і ёсць. Для кампаніі і арганізацыі работнік, які мае сям'ю і дзяцей — гэта залог стабільнасці і добрага іміджу. Трэба толькі аднесціся да яго з разуменнем, падтрымаць.**

Напрыклад, у Швецыі кампаніі, якія пазіцыянуюць сябе як сяброўскія да бацькоў (Parentsmart Companies), праводзяць гутаркі з супрацоўнікамі перад тым, як адправіць іх у дэкрэтны водпуск. Высвятляюць, ці жадае чалавек падчас водпуску ўдзельнічаць у планёрках, агульных сустрэчах і абмеркаваннях вытворчага працэсу. Самі сходы арганізоўць у зручны для бацькоў з малымі дзецьмі час. Ёсць таксама магчымасць працаваць некалькі дзён у тыдзень (няпоўны водпуск), заробак у такіх кампаніях пераглядаюць і рэгулярна павышаюць у тым ліку для тых, хто даглядае малых дзяцей. Але самае галоўнае — узровень дапамогі бацькам, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе за дзіцем, практычна роўны заробку (часткова даплачваюць самі кампаніі).

## УКЛЮЧЫЦЬ ТАТУ

Але і гэта яшчэ не ўсё. Можна даць жанчыне з малым дзіцем магчымасць працаваць і нават добра ёй заплаціць, але калі яна будзе прыходзіць з работы стомленая, а ёй яшчэ трэба забраць малое з садка, купіць прадукты, прыгатаваць вячэру, адпрасаваць вопратку на заўтра, пагуляць з малым, пагутарыць з ім, прыбрацца, а раніцай усіх сабраць і накарміць, прыгатаваць «ссабойкі»... То як на доўга яе хопіць?

Таму нічога з гэтага не спрацуе, пакуль абавязкі па доме мужчына не падзеліць пароўну з жанчынай. Мы пакуль, як і ў заробках, вельмі далёкія тут ад ідэалу. У Беларусі жанчыны працаздольнага ўзросту больш за 19 працэнтаў свайго часу выдаткоўваюць на неаплатную працу — на работу і клопат па доме, мужчыны — 9,5 працэнта. Жанчына на адну гадзіну 44 хвіліны даўжэй займаюцца вядзеннем хатняй гаспадаркі, чым мужчыны. А калі скласці ўсю тыднёвую працоўную нагрузку (аплачаную і не), то ў жанчын яна акажацца на 7,5 гадзіны большай, чым у мужчын. Па сутнасці — яшчэ адзін рабочы дзень. Мужчыны адпачываюць, а жанчыны шчыруюць.

І вось каб кардынальна памяняць сітуацыю, патрэбны больш актыўны ўдзел мужчын у выхаванні дзяцей і вядзенні хатняй гаспадаркі. І самы эфектыўны спосаб зрабіць гэта — даць татам водпуск па доглядзе за дзіцем. Наша заканадаўства нават вельмі «за», але сярод тых, хто выкарыстоўвае водпуск па доглядзе за дзецьмі, толькі адзін працэнт татаў. І прычын таму некалькі. Першая — гэта, вядома, страта значнай часткі сямейнага даходу. Нараджэнне дзіцяці само па сабе адчувальна павялічвае сямейныя расходы. Дапамога на дзіця значна меншая за заробак таты, як і заробак маці (у большасці выпадкаў).

Акрамя таго, гэта якраз тая сітуацыя, дзе, на жаль, вялікае значэнне маюць стэрэатыпы. Дарэчы, у той жа Швецыі ў кампаніях, якія падтрымліваюць бацькоўства, прыклад у справе імкнуцца падаваць кіраўнікі — мужчыны. Яны самі і неаднойчы сыходзяць на некалькі месяцаў у водпуск па доглядзе за дзіцем і лічаць, што гэта вельмі зблізіжае іх з малымі, і з жонкай. І яшчэ адно важнае назіранне: у сем'ях, дзе жанчына адчувае сябе рэалізаванай на рабоце і не загружанай дома, сексуальнае жыццё больш яскравае, што станоўча ўплывае на ўсіх яе членаў. Проста людзі, усе — і мама, і тата, і дзіця — адчуваюць сябе больш шчаслівымі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Мамін дзённік

# ЧЫМ НАКАРМІЦЬ МАЛАЕЖКУ?

«Вось так! — сустракае мяне ўзрадаваная матуля, калі я пасля кароткага ад'езду па справах вяртаюся дамоў. — З маіх рук Арцёмка еў лепш, чым з тваіх!» Яна, маўляў, за кожным разам малога не выцірала, зубы загаворвала — вось Цёмік і паеў ад душы. «Ага, — сама сабе думаю, але не хачу парушаць яе ўзнёслы настрой. — Запяканку з тварагу ён есць, ажно вушы трасуцца, хто б яго ні карміў!»

Гэта хутчэй выключны выпадак. Звычайна чаго мы толькі не робім, каб малы паеў. І песні спяваем, і гісторыі розныя расказваем, і мульцікі ўключаем, і даём кубачак (лыжкай у ім пагрукаць), і разам «кормім» гумовага мішку яшчэ з майго дзяцінства — з бубнам толькі не танцуем! А каб і танцавалі, не факт, што талерка будзе пустая. Ды што казаць, часам малы нават не пакаштуе прыгатаванага! Мама кажа, прымушаць есці нельга, захоча — сам папросіць (у той жа час бабуля згадвае, як сілком адкрывала мне рот, каб я, малая, не засталася галодная).

Аказваецца, накарміць дзіця — праблема не толькі мая. Пляменнік наш есць толькі пельмені, сардэлькі, катлеты бабулі Аліны, бліны бабулі Надзі і мамін супчык. Пры гэтым маці яго добра гатуе. Даводзілася назіраць, і як суседскіх дзяцей на вуліцы кармілі. Бабуля ім нарабіла смакаты ў выглядзе ўзбітага тварагу з бананам і ягадамі, а яны па дзве лыжкі з'елі і... пачалі прасіць сасіскі. Затое наш прыгажун на чужы тварог быў ласы! На вуліцы, аказалася, есці смачней. Вось і выносіла пасля клубнічкі і малінкі, каб хоць крыху вітамінаў набраўся — за кампанію ж есці весялей. Увогуле, да ягады ў яго дзіўная любоў. Ніколі б не падумала, што наш Цёмік будзе любіць кіслыя вішні і парэчкі. А вось чарніцы выплюне, нават калі я незаўважна схаваю іх у лыжцы з кашай.

Ужо з маленства сучасныя дзеці ведаюць, што яны любяць, а што не. Сасіскі і сардэлькі, на жаль, у прыярытэце перад адбіўной ці мясной падліўкай. Добра, што наш хоць катлеты есць. Дзень гатую іх, на другі — тэфтэлі, а потым выдумляй, якой вячэрай дзіця накарміць (на сняданак і абед у нас традыцыйна — каша і суп). Хоць і тут моцна не разгуляешся: з крупы есць толькі грэчку, манку ды аўсянку. Пра суп таксама трэба ведаць: які на блэндар узбіць, каб атрымаўся крэм, а які зварыць звычайна — калі гародніна кубікамі і на тарку.

Працяглы час лічыла, што, акрамя вады ды малака, малы нічога не п'е. Колькі ні прапаноўвалі кампот ці кісялёк — усё дарэмна. Так і было б, каб не паехалі віншаваць сваіх хрэснікаў з Вялікаднем. Ехалі на паўдня, таму ўзяла малому большую бутэлечку з вадой (звычайна ён п'е з маленькай, грамаў на 200). У гасцях аказалася, што ён, вадахлёб, не хоча піць. Раз прапаноўваю, другі — адварочваецца і ўсё. Не той посуд быў, як мы потым зразумелі. Цяпер са сваёй маленькай бутэлечкі Цёмік п'е ўсё, штодзень па каструлі кампоту вару! Добра, што ёсць з чаго...

У нашых бацькоў, а тым больш у людзей старэйшага пакалення, такога выбару не было. Што мелі, тым і кармілі дзяцей. Асобна ім ніхто не варыў. Паелі ўсе з адной каструлі і чакалі вячэры. Трапіў бы мой Цёмік у мінулае, хадзіў бы са сваімі «фі» галодны. А я вось, у часе цяперашнім, стаю ды разразаю на кавалачкі хатняга трусіка, якога для любімага ўнука набыў у суседа дзядуля, ды галаву, што такога згатаваць, каб малы хоць бы пакаштаваў.

Вераніка КАНЮТА.